*Гоўзіч І.М.*

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. V КЛАС



## РАЗДЗЕЛ IV.
## ВЫРАЗНАСЦЬ МАСТАЦКАГА СЛОВА

1. Падрыхтуйце **фотакалаж** або калаж з рэпрадукцый і ўласных малюнкаў на тэму «Зімовы пейзаж».





2. У літаратурны сшытак запішыце **словы-асацыяцыі** да слова зіма (не менш за 10). Стварыце ўласную **казку** «Якой я люблю зіму», выкарыстоўваючы выпісаныя словы-асацыяцыі.

3. Уявіце сабе, што **Вы ствараеце каляровы гукавы фільм** па вершы Максіма Багдановіча «Зімой», у якім можна перадаць не толькі фарбы, але і гукі прыроды. Паспрабуйце апісаць першыя словы да гэтага фільма. Як іх агучыць?

4. Зрабіце **партытуру выразнага чытання** верша Максіма Багдановіча «Зімой». Пры яе складанні выкарыстайце наступныя ўмоўныя абазначэнні:

1. Асноўны націск _______ (слова падкрэсліваецца адной гарызантальнай рыскай).
2. Апорны націск --------- (слова падкрэсліваецца пункцірам).
3. Кароткая паўза ⊥ (перпендыкуляр).
4. Паўза першай даўжыні | (адна вертыкальная рыска).
5. Паўза другой даўжыні || (дзве вертыкальныя рыскі).
6. Павышэнне голасу ↗ (стрэлка ўверх).
7. Паніжэнне голасу ↘ (стрэлка ўніз).

5. Стварыце **цытатную характарыстыку герояў** з урыўка з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» «На рэчцы».

| Імя героя | Рыса характару | Цытата |
|---|---|---|
| | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

6. Прачытайце верш Анатоля Грачаннікава «Верасень» апусціўшы эпітэты. Паразважайце, што змянілася ў ім.

7. Паспрабуйце **аднавіць** верш Янкі Сіпакова «Ціхая мелодыя», уставіўшы замест кропак азначэнні

Блукаю, усхвалёваны нечым,
І чую ... (прыглушаны) шорах —
Штосьці рыхтуе вечар,
Збіраючы … (шэры) морак.

Пераймаю … (вячэрнія) цені,
Бы ягнят,
што вяртаюцца з поля.
Лаўлю цішыні трымценне,
Хвалююся, як ніколі.

Не кідаю … (зялёнай) вахты
І бачу:
як продкі на веча,
Дрэвы — … (зялёныя) яхты —
Сплываюцца ў … (ціхі) вечар.

8. Запішыце ў літаратурны сшытак **асацыятыўныя рады да кожнай з пары года**. Паспрабуйце напісаць невялікае чатырохрадкоўе, прысвечанае зіме, вясне, лету або восені, абавязкова выкарыстоўваючы словы-асацыяцыі.

9. Напішыце **сачыненне-мініяцюру** «Мая любімая пара года» або невялікую казку «Падарожжа па розных порах года».

10. Падрыхтуйце **конкурс выразнага чытання** пейзажных вершаў беларускіх паэтаў.

11. Выканайце **творчае заданне**: падрыхтуйце **вуснае сачыненне-фантазію** на тэму «Ура! Больш не будзе зімы».

12. Правядзіце інтэрв'ю, запоўніўшы табліцу:

| **Удзельнікі** | **Любімая пара года. Чаму** | **Нелюбімая пара года. Чаму** |
|---|---|---|
| 1. Жэня, 11 гадоў | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ